душевности», не видели морфологической сути феноменов, которая предполагала изучение «родства <…> связывающего язык форм всех культурных областей» [6, с. 17].

Магистральным направлением исторического исследования, включая его источниковедческий аспект, согласно теоретико-методологическим представлениям ученого, и должно было стать исследование исторической морфологии – изучение краеугольных формообразующих «математических идей эллинов, арабов, западноевропейцев», смысла «их ранней орнаментики, их архитектонических, метафизических драматических базовых форм», глубинной «формальной связи» между «античной государственной формой полиса и эвклидовой геометрией, пространственной перспективой западноевропейской живописи и преодолением пространства посредством дорог, телефонов и огнестрельного оружия, инструментальной музыкой и кредитной системой в экономике» [6, с. 17]. Такое морфологическое исследование, подчеркивал философ, позволило бы «впервые в истории» все указанные предметы понять и истолковать как символы и раскрыть их метафизическую суть [6, с. 17].

***Заключение.*** Взгляды Шпенглера на проблемы источниковедения развивались в русле его теоретико-методологических представлений об историческом процессе. Источниковедческие процедуры: анализ происхождения и содержания источника, проблема его достоверности, репрезентативности источниковой базы были вписаны философом истории в теоретико-методологический контекст доктрины. В источниковедческом аспекте методологии Шпенглера важную роль играла проблема исторической морфологии как жизненного, а в познании – историографического явления. Темпоральная характеристика памятника была ключевой в конкретизации «родного ландшафта», авторства, а также в интерпретации и установлении степени его достоверности. Философ обратил внимание на объективную связь формы исторического явления с моментом его продвижения как «организма» от «рождения» до «смерти». Он исходил из убеждения, что установление времени возникновения памятника, и времени как свидетельства его возраста раскрывало объективную динамику исторического процесса.


1. Зимовец, Л. Г. О. Шпенглер о смысле истории / Л. Г. Зимовец // Ученые записки Российского государственного социального университета. – 2009. – № 6. – С. 123–130.
2. Маджаров, А. С. История России в теории цивилизаций : монография / А. С. Маджаров. – Иркутск : Изд-во ИГУ, 2014. – 211 с.
3. Маджаров, А. С. Н. Я. Данилевский и О. Шпенглер о «славянском» и «романо-германском» культурно-исторических типах и перспективах их взаимодействия (сравнение концепции и метода) / А. С. Маджаров // Гуманитарный вектор. – 2022. – Т. 17, № 3. – С. 59–68.
4. Маджаров, А. С. Прикладная методология как проблема отечественной историографии XVIII– XIX века (постановка проблемы) / А. С. Маджаров // Гуманитарный вектор. – 2019. – Т. 14, № 6. – С. 57–64.
5. Румянцева, Т. Г. Методология гуманитарного познания Освальда Шпенглера (опыт современного прочтения) / Т. Г. Румянцева // Роль женщины в развитии современной науки и образования: материалы междунар. на- уч.-практ. конф. (г. Минск 17-18 мая 2016 г.) / ред. И. В. Казакова, А. В. Бутина, И. В. Олюнина. – Минск : БГУ, 2016. – С. 814–819.
6. Шпенглер, О. Закат Западного мира / О. Шпенглер. – М. : Альфа-книга, 2010. – 1085 с.



**Дулаў А.М.**


## ВОБРАЗ СЯРЭДНЯВЕЧЧА Ў ГІСТАРЫЧНЫМ НАРЫСЕ “ВІЦЕБСК” МІКАЛАЯ УЛАДЗІМІРАВІЧА І НІНЫ ІВАНАЎНЫ ДАРАФЕЕНКА[1]

Паняцце “медыявалізм” уключае ў сябе як уяўленні пра Сярэднявечча ў культуры наступных эпох, так і папулярны сёння ў гуманітарыстыцы даследчыцкі кірунак, што вывучае гэтыя ўяўленні. У дадзеным кантэксце падаецца перспектыўнай рэканструкцыя вобразаў сярэдневяковай эпохі, прэзентаваных у лакальных гістарычных наратывах XIX – пачатку XXI ст., якія ўплывалі/уплываюць на фарміраванне ў чытачоў уяўленняў як аб мінулым малой радзімы, гэтак і аб Сярэднявеччы як гістарычнай эпосе.

Відавочна, першым грунтоўным аглядам мінуўшчыны горада, у якім б надавалася больш-менш значная ўвага дарэвалюцыйнаму перыяду, пасля прац буйнейшага краязнаўцы Віцебшчыны А.П. Сапунова (1851–1924 гг.) стаў кароткі гістарычны нарыс “Віцебск” Мікалая Уладзіміравіча і Ніны Іванаўны Дарафеенка [4]. Нарыс быў надрукаваны ў 1958 г. у першым нумары літаратурна-мастацкага альманаха “Дзвіна” – выданні літаратурнага аб’яднання пры рэдакцыі газеты “Віцебскі рабочы”. Развіццё горада было прасочана ад яго вытокаў да канца 1930-х гг. Аб падзеях і героях Вялікай Айчыннай вайны, пасляваенным аднаўленні і перспектывах развіцця горада аўтары абяцалі расказаць у наступных нарысах [4, с. 152]. Мэта нашай працы – вызначыць, якім паўстае вобраз сярэднявечнага Віцебска на старонках гістарычнага нарыса М.У. і Н.І. Дарафеенка.


[1] Даследаванне выканана пры фінансавай падтрымцы БРФФД ў рамках НДР “Князь Альгерд і амір Цімур: актуалізацыя Сярэднявечча ў гістарычнай памяці Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Узбекістан на нацыянальна-дзяржаўным і рэгіянальным узроўнях” (Дамова № Г22УЗБ-065 ад 04 мая 2022 г.).

Варта падкрэсліць, што паняцце "Сярэднявечча" ў нарысе не ўжываецца. У савецкай гістарыяграфіі прымяняўся фармацыйны падыход, таму пры вызначэнні перыядаў падзей, працэсаў, з'яў айчыннай гісторыі крытэрыем служыла найперш змена сацыяльна-эканамічных фармацый. Звяртае на сябе ўвагу, што ў перыядызацыі гісторыі Віцебска Мікалай Уладзіміравіч і Ніна Іванаўна імкнуліся сумясціць фармацыйны падыход з дзяржаўніцкім, улічыць дзяржаўную прыналежнасць горада. Таму ўяўляецца абгрунтаваным прыцягнуць да аналізу першыя тры раздзелы нарыса, у якіх гісторыя Віцебска даведзена да ўваходжання горада ў склад Расійскай імперыі. Менавіта матэрыял гэтых раздзелаў дазваляе рэканструяваць транслюемыя ў нарысе ўяўленні пра сярэднявечныя рэаліі.

Аўтары нарыса – ураджэнцы Віцебшчыны, людзі, якія пакінулі след у гісторыі нашага горада. Ніна Іванаўна Дарафеенка (1923–2015), кандыдат гістарычных навук, выкладала ў медыцынскім і педагагічным інстытутах [8–9]. Мікалай Уладзіміравіч Дарафеенка (1923–1991), журналіст, працаваў на партыйнай і савецкай рабоце, быў галоўным рэдактарам газеты "Віцебскі рабочы", узначальваў камітэт па радыёвяшчанні і тэлебачанні [3; 13]. У гады Вялікай Айчыннай вайны Мікалай і Ніна Дарафеенка змагаліся з нацызмам: Ніна Іванаўна у патрыятычным падполлі і ў партызанах, а Мікалай Уладзіміравіч быў лётчыкам-знішчальнікам, ваяваў на Карэльскім фронце [8, с. 119–122; 6, арк. 3 адв., 5]. Нядзіўна, што справай іх жыцця стала даследаванне дзейнасці патрыятычнага падполля ў Віцебску ў 1941–1944 гг., адкрыццё гістарычнай праўды пра патрыётаў і ўшанаванне іх памяці. Кніга "Витебское подполье", напісаная Нінай Іванаўнай і Мікалаем Уладзіміравічам разам з Мікалаем Ільічом Пахомавым, вытрымала два выданні (у 1969 і 1974 гг.), да сённяшняга часу не страціла сваёй актуальнасці [10]. Главы з яе ў перакладзе на нямецкую мову у свой час друкаваліся ў газеце "NEUER TAG" (Франкфурт-на-Одэры, ГДР). У выданні, у аснову якога былі пакладзены матэрыялы кандыдацкай дысертацыі Ніны Іванаўны, вынікі яе сумеснай з Мікалаем Уладзіміравічам пошукавай працы, было названа больш за тысячу імёнаў змагароў з нацызмам, паказаны ўсенародны характар барацьбы, удзел у ёй замежных антыфашыстаў, звернута ўвага на найбольш важныя аперацыі падпольшчыкаў, раскрыта значэнне подзвіга Веры Харужай у акупаваным Віцебску [7; 8, с. 124–125; 9, с. 274].

Але акрамя перыяду Вялікай Айчыннай вайны М.У. Дарафеенку заўсёды цікавілі і больш раннія гістарычныя эпохі [2]. Гісторыяй ён, відаць, захапляўся з дзіцячых гадоў. Цікавасць гэта ўмацавалася падчас навучання ў Маскве ў Вышэйшай партыйнай школе, якую Мікалай Уладзіміравіч скончыў у 1956 г. [6, арк. 3]. Відавочна, менавіта пяру М.У. Дарафеенкі належыць значная частка тэксту кароткага нарыса 1958 г., што пацвярджаецца раздзеламі з кнігі 1974 г. з пазначаным аўтарствам [1, с. 223]. Тым не менш, бясспрэчна, што ўклад Ніны Іванаўны, як прафесійнага гісторыка, таксама важкі. Уяўляецца, што сумесна была выпрацавана канцэпцыя нарыса, Ніна Іванаўна дапамагала парадамі і канструктыўнай крытыкай часткі тэксту, напісанай мужам.

Нарыс уяўляе сабою папулярную версію гісторыі Віцебска і належыць да сацыяльна арыентаванага гісторыяпісання. На нашу думку, натхнілі Мікалая Уладзіміравіча і Ніну Іванаўну працы Аляксея Парфенавіча Сапунова, з якімі яны змаглі пазнаёміцца. Акрамя самога тэксту нарыса доказам такога меркавання можа быць з'яўленне ў 1957 г. у "Віцебскім рабочым" грунтоўнага артыкула аб дзейнасці А.П. Сапунова "Выдатны гісторык Віцебшчыны" [5], падпісанага "Н. Дарафеенка" [1]. Распачаўшаяся адліга ў грамадска-палітычным жыцці Савецкага Саюза зрабіла магчымым фактычнае вяртанне з нябыту імя Аляксея Парфенавіча. У артыкуле давалася ў цэлым станоўчая ацэнка дзейнасці гісторыка, на якім па-ранейшаму быў ярлык "буржуазнага". Паводле нашага меркавання, у Мікалая Уладзіміравіча і Ніны Іванаўны ўзнікла ідэя працягнуць працу А.П. Сапунова: напісаць сучасную кароткую гісторыю Віцебска з пазіцый марксісцка-ленінскай метадалогіі.

Даследаванні А.П. Сапунова, якія абазначаны ў нарысе як "буржуазны прагрэсіўны гісторык Віцебшчыны", сталі важнай крыніцай інфармацыі для аўтараў. Менавіта пад іх уплывам сфарміраваўся аўтарскі падыход да перыядызацыі (гл. табл.). Праўда, савецкая канцэпцыя гісторыі Беларусі ўнесла тут свае карэктывы. І калі прыметнікі "раннефеадальны", "феадальны" хутчэй маркіруюць прыналежнасць тэксту да марксісцкай гістарыяграфіі, то адмова ад традыцыйнага сярод расійскіх дарэвалюцыйных гісторыкаў азначэння "Літоўска-рускі перыяд", якім карыстаўся і А.П. Сапуноў, адлюстроўвае змену канцэптуальных трактовак гэтага перыяду гісторыі.

[1] Сучасны біёграф А.П. Сапунова Людміла Уладзіміраўна Хмяльніцкая заканамерна палічыла аўтарам Ніну Іванаўну [15]. Аднак сама Н.І. Дарафеенка паведаміла нам, што аўтарам артыкула быў Мікалай Уладзіміравіч [2]. Відавочна, ініцыял "Н." з'явіўся ў газеце ў сувязі з тым, што дзеючыя тады правілы беларускай арфаграфіі дапускалі выбар чалавекам адной з формаў імя. Для ураджэнца памежнай з РСФСР Лёзненшчыны і выпускніка рускамоўнай школы такой формай відавочна магла быць форма "Нікалай". А ў альманаху "Дзвіна", верагодна, рэдактары папраўлі на "Мікалай".

**Перыядызацыя гісторыі Віцебска да канца XVIII ст.**

| *Паводле А.П. Сапунова* | *Паводле М.У. і Н.І. Дарафеенка* |
|---|---|
| “Русский древний период (1021–1320)” | “Раннефеадальны стараpускі этап гісторыі Віцебска, які цягнуўся 300 год (1021–1320)…” |
| “Литовско-Русский период (1320–1569 г.)” | Віцебск “пад уладай літоўскіх феадалаў” (1320–1569 гг.) |
| “Период польско-литовско-русский или бело-русский (1569–1772)” | “Беларуска-польскі этап гісторыі феадальнага Віцебска” (1569–1772 гг.) |

Спасылкі на меркаванні прафесара Сапунова сустракаюцца ў тэксце [4, с. 130, 131, 133], у тым ліку, на выказанае ў канкрэтным артыкуле [12]. Але найперш з публікацый Аляксея Парфенавіча браліся факты. Прычым адбор іх вызначаўся палітыка-ідэалагічнымі прынцыпамі і адпавядаў, як і ўся канцэпцыя нарыса “Віцебск”, ідэйна-навуковым установкам, сфармуляваным у “Тэзісах аб асноўных пытаннях гісторыі БССР. Частка 1. Гісторыя беларускага народа да Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі” 1948 г. [14]. Тэзісы былі падрыхтаваныя вядучымі тагачаснымі гісторыкамі па рашэнні XV Пленума ЦК КП(б)Б і характарызаваліся выразнай скіраванасцю на барацьбу з нацыяналізмам. На абмеркаванні, якое адбылося ў кастрычніку 1948 г. у Аддзяленні грамадскіх навук АН БССР, былі адобраны прынцыповыя палажэнні тэзісаў, адзначана іх важнасць для развіцця гістарычнай навукі рэспублікі [16, с. 144].

У першым раздзеле нарыса “Калі гудзеў вечавы звон” акцэнтавана ўвага на некалькіх аспектах: уваходжанне Полацкага княства ў склад старажытнарускай дзяржавы; узнікненне Віцебска і яго месца сярод гарадоў Русі; віцебскія замкі, іх гістарычны лёс; рамеснае майстэрства і храбрасць віцяблян; гандлёвыя сувязі горада ў XIII–XIV стст. з “Рыгай і нямецкімі гарадамі”, захаванне славянскіх традыцый і імкненне да “Русі Вялікай, з якой былі звязаны агульнасцю паходжання, гістарычнага лёсу, культуры і тэрыторыі”; аслабленне ў перыяд феадальнай раздробленасці, супрацьстаянне літоўскім феадалам і ўваходжанне ў склад ВКЛ; роля веча.

Менавіта ў раскрыцці старажытнарускага перыяду, на наш погляд, найбольш адчувальны ўплыў прац А.П. Сапунова. У кантэксце праблемы ўзнікнення горада на Дзвіне М.У. і Н.І. Дарафеенка адзначаюць: “Калі і кім заснаван Віцебск дакладна не ўстаноўлена. Існуе многа здагадак, але ўсе яны мала абгрунтаваныя”. Аўтары прыводзяць паданне пра заснаванне Віцебска кіеўскай княгіняй Вольгай з агаворкай, што яно было запісана праз 800 гадоў пасля падзей, а Вольга не магла заснаваць Віцебск, бо памерла ў 969 г. Са спасылкай на “рад крыніц” гісторыкі выказалі меркаванне, што горад быў заснаваны ў другой палове IX ст., але адзначылі, што датай заснавання Віцебска прынята лічыць 1021 г., пад якім ён упершыню згаданы ў “афіцыйных летапісах” [4, с. 129].

У нарысе сцвярджаецца: “У невялікай сям'і старажытных рускіх гарадоў Віцебску належыць не апошняе месца. Гісторыя яго цесна звязана з лёсам Расіі, Украіны, Беларусі, Польшчы і Літвы” [4, с. 129]. Падкрэслена важнасць знаходжання горада на важнейшых водных і сухапутных шляхах, што вызначала яго ролю і спрыяла ўзмацненню.

Аўтары далі апісанне Віцебскіх замкаў з прывязкай да сучаснай тапаграфіі, адзначылі, што драўляны Верхні замак быў узведзены яшчэ ў XIII ст. “для абароны славянскіх зямель ад іншаземных захопнікаў, а ў пачатку XIV стагоддзя князь Альгерд «умацаваў Верхні замак каменнай сцяной і вежамі і ўпрыгожыў гэты замак палатамі», да Верхняга замка прыбудаваў Ніжні” [4, с. 129]. Зроблена дапушчэнне, што тады ж узнік і Узгорскі замак. Адзначана абарончая роля Віцебскіх замкаў, аб сцены якіх “не раз разбіваліся сілы чужаземцаў” [4, с. 130], што прывяло замкі да поўнага заняпаду ўжо ў канцы XVIII ст.

У нарысе падаецца цікавая трактоўка ўваходжання Віцебшчыны ў склад ВКЛ, якая грунтуецца на канцэпцыі літоўскага заваявання ўсходнеславянскіх земляў і лакальным патрыятызме аўтараў: быццам бы, у выніку раздробленасці і княжацкіх усобіц, якія аслаблялі Русь, Віцебшчына ўсё часцей стала падвяргацца нападам літоўскіх князёў. Нашы продкі паспяхова супрацьстаялі экспансіі “пры заступніцтве кіеўскіх, чарнігаўскіх і смаленскіх князёў”, таму Віцебскі ўдзел “захоўваў сваю незалежнасць да пачатку XIV ст.” [4, с. 130]. “Мужна і стойка абаранялі віцябляне кожны кавалачак зямлі ад націску літоўскіх феадалаў” [4, с. 130]. У 1245 г. у змаганні прыняў удзел нават “вядомы наўгародскі князь Аляксандр Неўскі”. Усе спробы захопу Віцебска не далі плёну, і толькі дзякуючы дынастычнаму шлюбу Віцебск увайшоў у склад “Літвы”: “Апошнім рускім удзельным князем быў Яраслаў Васільевіч, што выдаў у 1318 г. адзіную дачку Марыю за літоўскага князя Альгерда, які разам са сваёй жонкай пасяліўся ва Усвяце. Яраслаў памёр у 1320 г., Віцебск атрымала ў спадчыну дачка, а Альгерд, уступіўшы на вялікакняскі літоўскі трон, далучыў яго да Літвы. Упершыню пасля двухсотгадовага кіравання князямі рускімі Віцебск падпаў пад іншаземнае панаванне” [4, с. 130].

Завяршаецца першы раздзел нарыса згадкай пра веча, яго паўнамоцтвы. Аўтары разумеюць, што панавала на вечы феадальная арыстакратыя, часам купецкая вярхушка, але ”вечавы звон будзіў у народзе яго лепшыя свабодалюбівыя імкненні” [4, с. 131].

Характэрна, што першая частка нарыса найбольш багатая на імёны князёў. Тут згаданы кіеўская княгіня Вольга як легендарная заснавальніца, полацкі князь Брачыслаў Ізяславіч, які атрымаў горад у 1021 г. ад кіеўскага князя Яраслава Мудрага, наўгародскі князь Аляксандр Неўскі, які бараніў Віцебск ад літоўцаў у 1245 г., віцебскі князь Яраслаў Васільевіч, які выдаў сваю дачку Марыю замуж за літоўскага князя Альгерда, сам Альгерд, пры якім быў змураваны Верхні замак з палатамі. Аднак вялікая ўвага ім не надаецца, бо рухаючай сілай гісторыі ў марксісцкай трактоўцы выступаюць народныя масы, што выразна заўважаецца і ў аналізуемым нарысе.

Цікава, што ў дачыненні да Аляксандра Неўскага і Альгерда губляюцца важныя аспекты іх сувязі з Віцебскам, на якія ў свой час звяртаў увагу А.П. Сапуноў: не прыведзены звесткі пра сваяцтва Аляксандра Яраславіча з віцебскімі князямі, а таксама не акцэнтавана ўвага на тым, што Альгерд чвэрць стагоддзя быў князем віцебскім перад тым, як стаць вялікім князем літоўскім.

Другі раздзел носіць красамоўную назву “Пад ярмом польска-літоўскіх князёў”. Канцэптуальна ён цалкам адпавядае “Тэзісам аб асноўных пытаннях гісторыі БССР”. Перыяд уваходжання Віцебска ў склад Вялікага Княства Літоўскага да Люблінскай уніі паказаны літаральна ў двух абзацах, у якіх сфармуляваны ключавыя ідэі: 1) літоўскія феадалы “… імкнуліся ўсімі сіламі закабаліць беларускі народ, зрабіць яго гарады апорнымі пунктамі ў барацьбе з маскоўскімі князямі”; 2) становішча народа яшчэ больш пагоршылася пасля Крэўскай уніі 1385 г., калі на нашы землі сталі пранікаць і польскія феадалы; 3) літоўска-польскі прыгнёт не спыніў фарміраванне і развіццё беларускай народнасці, мовы і культуры; 4) у беларускага народа з года ў год умацоўвалася “… думка аб непарыўнасці яго лёсу з рускім народам”. Баявое адзінства рускіх, беларусаў, украінцаў гартавалася ў Грунвальдскай бітве 1410 г., у якой бралі ўдзел і “віцебскія палкі” і быў разгромлены “агрэсіўны тэўтонскі ордэн”; 5) “Гераізм і згуртаванасць віцяблян, іх сыноўняя адданасць рускаму народу прымусілі літоўскіх князёў дараваць жыхарам Віцебска і іншых беларускіх гарадоў усемагчымыя граматы, каб узмацніць на Віцебск свой уплыў, утрымаць яго пад сваім панаваннем” [4, с. 131].

Беларуска-польскі этап у гісторыі Віцебска характарызуецца як “… самы цяжкі і сумны час, калі Віцебск, як і ўся Беларусь, знаходзіліся пад трайным прыгнётам: феадальна-прыгонніцкім, нацыянальным і рэлігійным”. “Польскія магнаты і шляхта і апалячаныя беларускія феадалы падзялілі паміж сабой горад і гарадскія землі…”, а гарадскія рамеснікі “…туліліся ў сырых і цёмных хацінах, зямлянках і паўпадвалах…”, пакутвалі ад шматлікіх павіннасцяў і непасільных збораў, якія асуджалі просты люд на “…пастаянны голад, холад і масавае выміранне”. “Польскія паны ўсімі сродкамі і метадамі закабалення стараліся падавіць культуру беларускага народа, вытравіць у яго свядомасці ўсё рускае, праваслаўнае, ідэалагічна адарваць яго ад Расіі і духоўна падпарадкаваць свайму ўплыву”. Гэтым мэтам служыла Брэсцкая царкоўная ўнія 1596 г. “Мячом і крыжам укараняўся каталіцызм, знішчаліся праваслаўныя храмы, як грыбы раслі іезуіцкія манастыры і касцёлы. За кароткі тэрмін у параўнальна невялікім гарадку Віцебску было пабудавана каля двух дзясяткаў каталіцкіх і уніяцкіх цэркваў – чорных і каварных ачагоў каталіцкага цемрашальства, духоўнай зброі папы рымскага і польскіх каралёў” [4, с. 131].

Пераважная частка другога раздзела нарыса прысвечана супрацьстаянню праваслаўных віцяблян і полацкага ўніяцкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча, якое скончылася паўстаннем, забойствам апошняга ў Віцебску ў лістападзе 1623 г. і пакараннем горада і яго жыхароў у 1624 г. [4, с. 132–133]. Дарэчы, пра Магдэбургскае права, дараванае ў 1597 г., сказана колькі слоў менавіта ў сувязі з тым, што горад быў яго пазбаўлены. Аўтары прыйшлі да высновы: “Барацьба за праваслаўе была толькі праяўленнем аднаго з бакоў агульнага фронта нацыянальнай барацьбы супраць прыгнёту панскай Польшчы, за ўз’яднанне з вялікім рускім народам” [4, с. 133].

Тэма імкнення беларусаў, у т.л. віцяблян, да ўз’яднання з братнім рускім народам, галоўным чынам у часы Рэчы Паспалітай, стала цэнтральнай у трэцім раздзеле пад назвай “Барацьба за ажыццяўленне спрадвечнай мары”. Аўтары падкрэсліваюць дапамогу беларусам з боку “брацкага ўкраінскага народа”. Праўдзіва адзначана насычанасць XVI–XVII стст. спусташальнымі войнамі з Маскоўскай дзяржавай, між тым парадаксальна сцвярджаецца: “Але і гэта не зламіла волю віцяблян, якія ўсё больш і больш засвойвалі погляд на Маскоўскую Русь як на адзінага збавіцеля” [4, с. 133]. Замоўчваюцца пэўныя нюансы падзей. У прыватнасці, сказана, што Віцебск адным з першых гарадоў у 1654 г. добраахвотна адчыніў вароты Маскоўскаму цару, хаця А.П. Сапуноў у свой час не хаваў, што горад быў ўзяты ў лістападзе 1654 г. баярынам В.П. Шарамецьевым пасля 14 тыдняў аблогі [11, с. 580]. У нарысе згадана пра пажар 1708 г., аднак яго прычыны, якія раскрыты А.П. Сапуновым

(спаленне па загадзе Пятра I казакамі і калмыкамі пад кіраўніцтвам капітана Салаўёва) [11, с. 581], не названы. Пры гэтым паводле А.П. Сапунова прыводзяцца звесткі пра наведванне горада Пятром I [4, с. 134].

Такім чынам, гістарычны нарыс "Віцебск" Мікалая Уладзіміравіча і Ніны Іванаўны Дарафеенка фактычна ўпершыню ў пасляваенны час знаёміў віцяблян з сярэднявечнай гісторыяй горада. Канешне ж, нарыс нясе на сабе адбітак часу. Галоўнымі канцэптуальнымі ідэямі, якія праходзяць праз увесь тэкст, з'яўляюцца ідэя ўсходнеславянскага адзінства і вынікаючая з яе ідэя спрадвечнага імкнення беларускага народа да ўз'яднання з братнім рускім народам. Прычым у дадзеным выпадку ўстаноўкі "Тэзісаў аб асноўных пытаннях гісторыі БССР" 1948 г. супадалі з пазіцыяй А.П. Сапунова, працы якога сталі асноўнай крыніцай фактологіі першых раздзелаў. Праўда, у адрозненне ад Аляксея Парфенавіча, які шмат пісаў пра дзейнасць князёў, фокус увагі ў нарысе М.У. і Н.І. Дарафеенка змясціўся на ролю ў гісторыі народных мас.

Найбольшая колькасць сярэднявечных рэалій натуральным чынам акрэслена ў першым раздзеле. Тут заўважаюцца элементы рамантызацыі, але не ўласна Сярэднявечча, а менавіта старажытнарускага перыяду гісторыі Віцебска, важнага ў кантэксце адзінства ўсходніх славян. Тым не менш, аб'ектыўна на старонках першага раздзела нарыса паўстае эпоха замкаў, майстроў-рамеснікаў, мужных продкаў, вечавага народапраўства, няхай і абмежаванага, а таксама незалежнасці ад чужынскага панавання.

Адмоўна паказана знаходжанне Віцебска ў складзе Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, дзе феадальны прыгнёт сумяшчаўся з нацыянальным і рэлігійным, здзяйснялася палітыка акаталічвання і апалячвання беларусаў, якія імкнуліся да вызвалення ад ярма польска-літоўскіх паноў і ўз'яднання з рускім народам. Такім чынам, характарыстыка рэалій Сярэднявечча дапаўняецца ўрэшце такімі маркёрамі як "прыгнёт" і "цемрашальства". Аднак і ў дадзеным выпадку мае месца пэўная рамантызацыя мінулага: адзначаны гераізм продкаў у Грунвальдскай бітве, паказана іх мужнасць і згуртаванасць у барацьбе з прыгнётам, згадана Магдэбургскае права – "права на самакіраванне і іншыя вольнасці".

Падыходы да тлумачэння сярэднявечнай гісторыі Віцебска, сфармуляваныя ў гістарычным нарысе М.У. і Н.І. Дарафеенка, паслужылі асновай для пазнейшых савецкіх выданняў па гісторыі горада, што выйшлі ў канцы 1950-х – 1980-я гг.


1. Витебск. Историко-экономический очерк / редкол.: В. П. Ворбьева [и др.]. – Минск : Наука и техника, 1974. – 224 с.
2. Гутарка з Дарафеенка Нінай Іванаўнай, 1923 г.н. ад 12.05.2009 г. (Аўдыёзапіс) // Асабісты архіў аўтара.
3. Дарафеенка Мікалай Уладзіміравіч // Півавар, М. В. Краязнаўцы Віцебшчыны другой паловы XX – пачатку XXI ст. : біябібліяграфічны даведнік / М.В. Півавар. – Мінск : Кнігазбор, 2010. – С. 93.
4. Дарафеенка, М. Віцебск (Кароткі гістарычны нарыс) / М. Дарафеенка, Н. Дарафеенка // Дзвіна : літаратурна-мастацкі альманах. – Віцебск, 1958. – С. 128–152.
5. Дарафеенка, Н. Выдатны гісторык Віцебшчыны / Н. Дарафеенка // Віцебскі рабочы. – 1957. – 26 ліп. – С. 3.
6. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 102. Воп. 35. Спр. 56.
7. Дулаў, А. М. Гісторыя віцебскага падполля ў працах Н. І. Дарафеенка / А. М. Дулаў // Вклад белорусского народа в Великую Победу : материалы респ. науч.-практ. конф., Минск, 27 ноября 2009 г. / редкол.: Е. А. Гребень (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГАТУ, 2010. – С. 88–95.
8. Дулаў, А. М. Н. І. Дарафеенка – удзельніца руху супраціўлення і даследчыца Віцебскага падполля / А. М. Дулаў // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Віцебск, 18–19 чэрвеня 2009 г. / Віц. дзярж. ун-т ; рэдкал.: В. У. Акуневіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Віцебск : УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2009. – С. 117–128.
9. Дулаў, А. М. Патрыётка, даследчыца, педагог: памяці Ніны Іванаўны Дарафеенка / А. М. Дулаў // Наука – образованию, производству, экономике : материалы XXI(68) Региональной научно-практической конференции преподавателей, научных сотрудников и аспирантов, 10–11 февраля 2016 г., Витебск / Вит. гос. ун-т ; редкол.: И. М. Прищепа (гл. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2016. – Т. 1. – С. 272–275.
10. Пахомов, Н. И. Витебское подполье. – 2-е изд., перераб. и доп. / Н. И. Пахомов, Н. И. Дорофеенко, Н. В. Дорофеенко – Минск : Беларусь, 1974. – 248 с.
11. Сапунов, А. П. Историко-статистический очерк города Витебска / А. П. Сапунов // Витебская старина. Составил и издал А. Сапунов. – Витебск : Типография губернского правления, 1893. – Т. 1. – С. 559–622.
12. Сапунов, А. П. Исторические отношения Руси Белой и Великой / А. П. Сапунов // Памятная книжка Витебской губернии на 1898 г. Издание Витебского губернского статистического комитета. – Витебск : Губернская типография, 1898. – Приложения. – С. 1–20.
13. Скапа, У. Вернасць прызванню [М.У. Дарафеенка] / У. Скапа // Віцебскі рабочы – 80 год / Рэдакцыя абласной газеты "Віцебскі рабочы". – Віцебск, 1997. – С. 141–144.
14. Тэзісы аб асноўных пытаннях гісторыі БССР (Частка 1) // Большэвік Беларусі. – 1948. – № 8. – С. 36–72.
15. Хмяльніцкая, Л. Гісторык з Віцебска (жыццяпіс Аляксея Сапунова) / Л. Хмяльніцкая. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2001. – 256 с.
16. Храпко, Л. П. Уплыў грамадска-палітычнай сітуацыі другой паловы 40-х – першай паловы 50-х гадоў на развіццё гістарычнай навукі ў БССР / Л. П. Храпко // Старонкі гісторыі Беларусі / М. М. Крывальцэвіч, С. Я. Рассадзін, А. В. Іоў [і інш.] ; рэдкал.: М. П. Касцюк [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – С. 140–148.